Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ТЭХНІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Кафеда “Гісторыя, сусветная і айчынная культура”

С.В. Багалейша

Вучэбна-метадычны дапаможнік

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: метадычныя рэкамендацыі для падрыхтоўкі к практычным заняткам

для студэнтаў усіх спецыяльнасцяў БНТУ

Электронны навучальны матэрыял

Мінск, 2015

УДК
ББК

**Аўтор**
С.В. Багалейша, дацент кафедры “Гісторыя, сусветная і айчынная культура”

**Рэцэнзент**
Т.І. Палікоўская, дацэнт кафедры “Эканамічная гісторыя” Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта

Вучэбна-метадычны дапаможнік прадстаўляе сабою метадычныя рэкамендацыі для падрыхтоўкі к практычным заняткам па гісторыі Беларусі для студэнтаў усіх спецыяльнасцяў БНТУ.

Дапаможнік уключае рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай працы студэнтаў, пералік тэм практычных заняткаў і асноўныя пытанні для абмеккавання, тэмы рэфератаў, паведамленняў, прэзентацый, а таксама асноўную і дадатковую літаратуру.

Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт
пр-т Незалежнасці, 65 г. Мінск, Рэспубліка Беларусь
Тэл. (017)292-77-52, (017)293-95-35
E-mail:emd@bntu.by
Рэгістрацыйны № БНТУ/ФТУГ01-47.2015

# АГЛАЎЛЕННЕ


ПРАДМОВА ....... 4
АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ ....... 7
Як працаваць на лекцыях ....... 7
Рэкамендацыі па афармленні канспекта: ....... 8
Як працаваць на семінарскіх занятках ....... 8
Праца над навуковай і вучэбнай літаратурай ....... 10
Як правільна падрыхтаваць рэферат? ....... 14
Прыклад афармлення тытульнага ліста: ....... 16
Што сабой ўяўляе даклад і як яго падрыхтаваць. ....... 17
Як падрыхтаваць даклад? ....... 17
Алгарытм адпрацоўкі прапушчанага практычнага занятку ....... 18
Тэматычны план по абавязковым модулі «Гісторыя» (Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі) ....... 19
ПЛАНЫ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ ....... 20
Семінар 1. Асаблівасці фарміравання беларускай народнасці і этнасу ....... 20
Семінар 2. Палітычная гісторыя беларускіх зямель у IX - XVIII ст.ст. ....... 21
Семінар 3. Палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пач. XX стст.) ....... 24
Семінар 4. Фарміраванне і ўмацаванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі (кастрычнік 1917-чэрвень 1941 гг.) ....... 27
Семінар 5. Фарміраванне і ўмацаванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі (кастрычнік 1917-чэрвень 1941 гг.) ....... 28
Семінар 6. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны (верасень 1939 г. – верасень 1945 г.) ....... 29
Семінар 7. Асноўныя тэндэнцыі развіцця БССР у др.пал.1940-х – 1980-я гг. ....... 30
Семінар 8. Станаўленне і развіццё суверэннай Рэспублікі Беларусь (1990 – 2012 гг.) ....... 31
ПЕРАЛІК ЛІТАРАТУРЫ ПА АБАВЯЗКОВЫМ МОДУЛІ «ГІСТОРЫЯ» ....... 38
Асноўная літаратура ....... 38
Дадатковая літаратура ....... 39
Пытанні да заліку па абавязковым модулі «ГІСТОРЫЯ» ....... 43

## ПРАДМОВА

Вывучэнне гісторыі Беларусі займае важнае месца ў сістэме гуманітарных дысцыплін у вышэйшых навучальных установах. Яно накіравана на фарміраванне ў студэнтаў разумення заканамернасцей і асаблівасцей гістарычнага працэсу, навуковага светапогляду і перакананняў у адпаведнасці з ідэямі гуманізму, патрыятызму і ўзаемаразумення паміж народамі.

Асноўныя мэты сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў: фарміраванне і развіццё сацыяльна-асабістых кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-каштоўным і сацыяльна-творчым вопыце, што забяспечвае вырашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асабістых задач і функцый. Складовай часткай сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі з'яўляецца курс «Гісторыі Беларусі». Асноўнымі мэтамі яго вывучэння з’яўляюцца:

- фарміраванне ў студэнтаў канцэптуальнага гістарычнага мыслення, заснаванага на катэгорыях, паняццях і канцэпцыях гістарычнай навукі;
- засваенне айчыннага і сусветнага гістарычнага вопыта, які дапаможа арыентавацца ў часе і прасторы, вызначаць асноўныя тэндэнцыі гістарычнага развіцця; а таксама сродкі вырашэння сучасных праблем;
- выяўленне складанасці працэсу развіцця ведаў аб гісторыі і выпрацоўка разумення таго, што гістарычныя з'явы і падзеі абумоўліваюцца канкрэтна-гістарычнымі абставінамі.

У выніку вывучэння гісторыі Беларусі студэнты павінны:

а) ведаць:

- асноўныя тэорыі грамадскага развіцця ў адпаведнасці з фармацыйным і цывілізацыйным падыходамі;
- асноўныя этапы фарміравання беларускага этнасу ў розныя гістарычныя перыяды;
- сутнасныя характарыстыкі еўрапейскага, расійскага, савецкага і сучасных шляхоў мадэрнізацыі ў сацыяльна-эканамічнай, ідэйна-палітычнай, культурнай і духоўнай абласцях;
- асноўныя этапы станаўлення дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, беларускай дзяржаўнасці і дзяржаўнага суверэнітэта Рэспублікі Беларусь;

- асноўныя дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі, культурна-гістарычнай спадчыны беларускага грамадства;

б) умець:

- прымяняць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы пры характарыстыцы заканамернасцей і асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускага соцыума;

- тлумачыць уплыў розных культурна-цывілізацыйных фактараў на сацыяльна-эканамічнае, дзяржаўна-палітычнае, этнаканфесійнае і культурнае развіццё Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды;

- ажыццяўляць параўнаўчы аналіз рэформ і рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства, вызначаць сутнасныя характарыстыкі сучаснай беларускай мадэлі грамадскага развіцця;

- ацэньваць асноўныя дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі ў кантэксце гістарычнага развіцця і выкарыстоўваць (прымнажаць) культурна-гістарычную спадчыну Беларусі ў сваёй прафесійнай дзейнасці;

- характарызаваць ролю і месца беларускіх зямель у рэгіянальным цывілізацыйным і геапалітычным развіцці ў розныя гістарычныя перыяды, месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучаснай геапалітычнай сітуацыі ва ўмовах інтэграцыі і глабалізацыі.

Мэта дадзенага вучэбна-метадычнага дапаможніка – садзейнічаць арганізацыі вучэбнай працы студэнтаў дзённай формы навучання, дапамагчы ім падрыхтавацца да практычных заняткаў па рэйтынгавай сістэме навучання, вывучыць курс і паспяхова здаць дыферанцыяваны залік па гісторыі Беларусі. Тэматыка пытанняў да практычных заняткаў складзена на аснове вучэбнай праграмы па абавязковым модулі “Гісторыя Беларусі” для ўсіх спецыяльнасцяў БНТУ.

Дадзенае метадычнае электроннае выданне прызначана для студэнтаў усіх факультэтаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта і прызвана дапамагчы ім лепш асэнсаваць тэарытычны матэрыял па найбольш важных і складаных тэмах курса. Рэкамендацыі па правільнай арганізацыі самастойнай працы, вылучэнне характэрных гістарычных паняццяў, асноўных падзей і знакамітых асоб накіраваны на тое, каб зрабіць падрыхтоўку да семінараў і залікова-экзаменацыйнай сесіі больш рацыянальнай і паспяховай.

Міжтым абмежаваная колькасць аудыторных заняткаў і агульнадаступнасць шматлікіх друкаваных выданняў па гісторыі патрабуюць сёння ад студэнтаў самастойнага засваення значнай часткі вучэбнага матэрыялу. Пры гэтым адзначым, што пад самастойнай працай разумеюцца разнабаковыя віды індывідуальнай і калектыўнай вучэбнай дзейнасці пад час аудыторных і пазааудыторных заняткаў (у бібліятэцы, дамашніх умовах і г.д.) па выкананню розных заданняў пад непасрэдным або апасродкаваным кіраўніцтвам выкладчыка.

Практычныя заняткі па гісторыі Беларусі праводзяцца ў форме семінараў. Яны ўяўляюць сабой калектыўнае творчае абмеркаванне студэнтамі пад кіраўніцтвам выкладчыка матэрыяла, які быў вывучаны

студэнтамі самастойна. Менавіта на семінарскіх занятках правяраюцца, удакладняюцца і сістэматызуюцца веды студэнтаў, набываецца вопыт выступленняў.

# АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

## *Як працаваць на лекцыях*

Лекцыя – адзін з важнейшых відаў вучэбных заняткаў у ВНУ, калі пэўныя веды перадаюцца студэнтам ад выкладчыкаў у вуснай форме. Лекцыя дае сістэматызаванае ўяўленне аб вывучаемым курсе. У ёй адлюстроўваецца ўсё тое каштоўнае і новае, што ёсць у дадзенай навуцы на сённяшні дзень, і ўсе тое, што не знайшло адлюстравання ў падручніках і дапаможніках. І хаця на лекцыі выкладаюцца веды не ва ўсёй паўнаце (вывучыць прадмет па аднаму лекцыйнаму курсу не магчыма), аднак толькі на лекцыях можна вызначыць правільны падыход да вывучэння выкладаемай дысцыпліны, зразумець самае асноўнае і важнае.

Лекцыя – гэта творчы працэс, у якім удзельнічаюць лектар і слухачы. Лектар не толькі інфармуе, але і вучыць лагічна думаць, лаканічна і прыгожа выкладаць матэрыял. Да сустрэчы з ім трэба рыхтавацца.

Падрыхтоўка студэнтаў да лекцыі можа ўключаць у сябе наступнае.

1. Прагляд перад лекцыяй зместу папярэдняй тэмы па канспекту або падручніку.
2. Азнаямленне з асноўнымі паняццямі, падзеямі, гістарычнымі асобамі, адпаведнай тэмы дадзенага метадычнага выдання і пытаннямі да самакантролю.
3. Выяўленне пытанняў, на якія неабходна звярнуць найбольшую ўвагу пры праслухоўванні наступнай лекцыі.

Слуханне лекцыі –гэта творчая і даволі нялёгкая праца. Яна пачынаецца з мэтанакіраванай канцэнтрацыі ўвагі. Слухаць лекцыю трэба ўважліва, засяроджана, увесь час сачыць за ходам думкі лектара.

Пры слуханні лекцыі ідзе інтэнсіўнае засваенне інфармацыі. Неабходна зразумець навуковую сутнасць тэмы, яе сувязь з жыццём, узаемасувязь дадзенай лекцыі з іншымі лекцыямі, магчыма, сумежнымі навукамі, асэнсаваць сфармуляваныя законы і паняцці навукі, прыведзеныя факты, доказы, аргументацыю выдзеленых палажэнняў. Слухачы павінны быць тактоўнымі ў дачыненні не толькі да выкладчыка, але і да сваіх таварышаў. Узнікшыя пытанні задаюцца лектару з яго дазволу, а абмяркоўваюцца паміж сабой пасля лекцыі.

Канспектаванне зместу лекцыі істотна аблягчае разуменне і запамінанне матэрыялу. Весці запіс лекцыі не так проста. Тут таксама неабходны валявыя намаганні, праца над сабой (трэніроўка і вопыт дапамагаюць пераадолець цяжкасці).

Важна навучыцца вылучаць і запісваць галоўныя навуковыя палажэнні і факты, высновы і абагульненні. Найбольш мэтазгодным з'яўляецца тэзісна-аргументаваны характар канспекта, калі запісваюцца толькі асноўныя палажэнні і шэраг падмацоўваючых іх фактаў.

Для паскарэння запісу неабходна шырока выкаростоўваць скарачэнні слоў, умоўныя знакі, сімвалы. Карысна прадумаць індывідуальную сістэму скарачэнняў, запісаць і запомніць прынятыя абазначэнні, сімвалы і папаўняць іх па меры з'яўлення новых тэрмінаў і паняццяў. Навыкі канспектавання даюцца лягчэй, калі запіс сэнсу лекцыі вядзецца сваімі словамі, а не фразамі лектара.

Канспектаванне лекцый –працэс індывідуальны. Таму чужыя канспекты звычайна не забяспечваюць паспяховага авалодвання матэрыялам.

### *Рэкамендацыі па афармленні канспекта:*

-пранумаруйце старонкі ў сшытках;
-на першым (або апошнім) лісце сшытка прывядзіце змест назваў лекцый, па якіх вы склалі канспект, з указаннем адпаведных старонак;
-канспект кожнай новай лекцыі пачынайце з новай старонкі: запішыце дату заняткаў, назву тэмы і план лекцыі;
-пакідайце на старонках сшытка вялікія палі, на якіх у час хатняй работы можна б было запісваць свае заўвагі, дапаўненні, цытаты, кароткія вытрымкі з падручнікаў і кніг;
-рабіце запісы змястоўна, дакладна, разборліва, выдзяляючы разделы і падразделы, тэмы і падтэмы.

Пачынаць работу над канспектам не рэкамендуецца адразу ж пасля лекцыйных заняткаў, аднак і адкладваць яе надоўга таксама нельга.

Работа над канспектам лекцыі вядзецца наступным чынам:

1) паўтараецца вывучаны матэрыял па канспекту і ўсё, што незразумела, пазначаецца на палях канспекта і ўдакладняецца;

2) незавершаныя фразы, прапушчаныя словы і іншыя недакладнасці ў запісах ліквідуюцца з выкарыстаннем падручніка або іншых крыніц;

3) завяршаецца тэхнічнае афармленне канспекта: падкрэсліваюцца важнейшыя палажэнні, вылучаецца галоўнае, абазначаюцца раздзелы, падраздзелы, пытанні.

### *Як працаваць на семінарскіх занятках*

На семінарскіх занятках выступаюць студэнты, выяўляючы свае веды па разглядаемай тэме. Выступленні могуць быць рознымі па форме: чытанне рэферата, даклад па асноўным пытанні, судаклад, дапаўненне, папраўка, абагульненне. Тэма семінара з'яўляецца агульнай для ўсёй групы студэнтаў. Звычайна кожны з іх рыхтуецца па кожным з разглядаемых на семінары пытанняў. Выступленні і даклады, зробленыя на семінары, абмяркоўваюцца. У выніку можа ўзнікнуць дыскусія, што садзейнічае развіццю ў студэнтаў здольнасцей дакладна выкладаць свае думкі, быць пераканаўчымі ў спрэчцы. Падчас семінара выяўляюцца незразумелыя і недастаткова засвоеныя

пытанні, якія ўдакладняюцца. Выкладчык кіруе семінарам, пры неабходнасці дапаўняе і выпраўляе студэнтаў.

Асновай для падрыхтоўкі студэнтаў да семінарскіх заняткаў з'яўляецца распрацаваны кафедрай план заняткаў. У ім даюцца назвы ўсіх семінарскіх заняткаў з указаннем колькасці выдзеленых на іх разгляд гадзін, пералічваюцца вывучаемыя пытанні, асноўная і дадатковая літаратура.

У працэсе падрыхтоўкі да семінара неабходна:

- пазнаёміцца з тэмай заняткаў, планам і спісам рэкамендаванай літаратуры (прыведзены ў дадзеным дапаможніку);
- вывучыць адпаведныя раздзелы вучэбнага дапаможніка і прачытаць рэкамендаваную да заняткаў літаратуру, скласці на яе падставе канспект;
- скласці разгорнуты план выступленняў па кожнаму пытанню плана.

<u>У падрыхтоўцы да заняткаў выдзяляюцца наступныя этапы.</u>

1. Падрыхтоўчы. Ён уключае азнаямленне з тэмай семінара, вывучэнне зместу плана, вызначэнне аб'ёму працы, выпрацоўку плана падрыхтоўкі.
2. Засваенне асноўнага вучэбнага матэрыялу. Выкарыстоўваюцца канспект лекцыі і падручнік, які служыць у якасці ўдакладняючай крыніцы ведаў.
3. Паглыбленне ведаў. Спачатку чытаецца найбольш важная спецыяльная літаратура па тэме, пасля – дадатковая, у тым ліку энцыклапедыі. Па магчымасці праглядаецца Інтэрнэт. Пры гэтым робяцца выпіскі па кожным з разглядаемых пытанняў тэмы. Пажадана выпісваць таксама незразумелыя словы і выразы з тым, каб пазней удакладніць іх значэнне праз даведачную літаратуру або ў выкладчыка.
4. Заключны этап. Пасля назапашвання матэрыяла важна асэнсаваць яго, для чаго карысна прадумаць і скласці план выступлення па кожным з пытанняў разглядаемай тэмы.

Семінар стане цікавым і карысным толькі тады, калі кожны студэнт падрыхтуецца да заняткаў настолькі добра, што ў яго ўзнікне жаданне выказаць свае меркаванні і падзяліцца сваімі думкамі.

Да студэнтаў на семінарскіх занятках прад'яўляюцца наступныя патрабаванні.

1. Абавязкова прыходзіць на заняткі падрыхтаванымі.
2. Калі ў працэсе падрыхтоўкі да семінара выяўляюцца складанасці, звяртацца за кансультацыяй да выкладчыка.
3. Быць актыўным на занятках, выказваць свае думкі, заўвагі, дапаўняць і ўдакладняць адказы таварышаў, задаваць ім пытанні.
4. Пасля заняткаў унесці неабходныя змены ў канспекты, спіс літаратуры з улікам выступленняў на семінарскіх занятках.

<u>Важна прытрымлівацца агульных патрабаванняў да выступлення на семінарскіх занятках.</u>

1. Скласці план выступлення, надаць яму стройную структуру.
2. Дакладна і лаканічна выкладаць думкі, сачыць за якасцю мовы.
3. Творча выкарыстоўваць усе веды па дадзеным пытанні, набытыя з розных крыніц: кніг, лекцый, інтэрнэта, з асабістага вопыту і назіранняў.
4. Рабіць аргументаваныя, пераканаўчыя і дакладныя высновы.
5. Выступаючы з дапаўненнямі, не паўтараць ужо сказанае таварышамі. Каб пазбегнуць паўтораў, неабходна быць уважлівым і адразу ж уносіць змены ў асабісты план выступлення.

## *Праца над навуковай і вучэбнай літаратурай*

Пры рабоце над навуковай і вучэбнай літаратурай трэба выбраць з яе істотнае і неабходнае, апусціўшы другаснае і ўжо вядомае. Існуе шэраг агульных прыёмаў работы з кнігай. Вось некаторыя з іх.

1. Пры першым чытанні кнігі мэтазгодна пачынаць з папярэдняга азнаямлення з ёй – прачытаць тытульны ліст, звярнуць увагу на прозвішча аўтара, дакладную назву кнігі, месца выдання, выдавецтва і год выдання.
2. Затым карысна азнаёміцца з анатацыяй выдавецтва на першым лісце кнігі, прагледзець загалоўкі, якія даюць агульнае ўяўленне аб структуры, змесце выдання і прынятай аўтарам сістэматызацыі матэрыяла.
3. Потым пажадана прачытаць уводзіны, дзе фармулююцца задачы і метады выкладання.
4. Перад чытаннем падручніка карысна прагледзець канспект адпаведнай лекцыі, што дазваляе вызначыць галоўнае і найбольш цікавае для вас у гэтым падручніку.

*Пры чытанні навуковай і вучэбнай літаратуры варта прытрымлівацца наступных правілаў.*

Чытаць іх заўсёды з алоўкам і паперай для запісаў. Аднак падкрэсліваць алоўкам можна толькі ва ўласнай кнізе.

Мець пад рукой неабходныя слоўнікі і даведнікі.

Чытанне павінна быць актыўным, гэта значыць чытаннем-мысленнем, што дазваляе глыбока зразумець змест выдання і хутка засвоіць яго.

Прачытаўшы кнігу, карысна падумаць, чаму новаму яна навучыла.

Важна звязваць новае з раней вывучаным, а для гэтага трэба знайсці яму адпаведнае месца ў агульнай сістэме сваіх ведаў, уменняў і навыкаў.

Успрымаць змест з пазіцый асабістага жыццёвага вопыту, падмацоўваючы яго ўжо вядомымі прыкладамі.

Старацца самастойна разабрацца ў праблемах, якія могуць узнікнуць пры чытанні.

Каб атрыманыя пры чытанні веды былі глыбокімі і трывалымі, рэкамендуецца прытрымлівацца двух правілаў: дасканалае разуменне і трывалае засваенне прачытанага.

Рэалізацыя першага правіла можа ажыццяўляцца наступным чынам.

**1.** Глыбокае разуменне зместу кнігі заўсёды пачынаецца з вылучэння ў ім галоўнага, істотнага. А гэта тое, што найбольш поўна характэрызуе матэрыял з пункту гледжання яго тэарэтычнай і практычнай значнасці для вывучаемай дысцыпліны і спецыяльнасці.

**2.** Наступным крокам на шляху да глыбокага разумення прачытанага з'яўляецца выяўленне лагічных сувязяў паміж галоўнымі палажэннямі, якія ўтрымліваюцца ў тым або іншым раздзеле выдання. Да іх адносяцца, напрыклад, прычынна-выніковыя сувязі.

**3.** Аднак неабходна выяўляць і іншыя лагічныя сувязі – па падабенстве і адрозненнях, па супрацьлегласцях і ўзаемазалежнасцях і г.д. Параўноўваючы розныя з'явы, выяўляючы ў іх агульныя і спецыфічныя рысы і заканамернасці, можна глыбей унікнуць у сутнасць вывучаемага матэрыялу. Трэба разумець, што паміж тым матэрыялам, што вывучаецца сёння, і тым, што вывучаўся ўчора, могуць і павінны існаваць нейкія сувязі. Выяўленне гэтых сувязяў якраз і дазваляе ўключаць новыя веды ў лагічную сістэму ўжо існуючых і тым самым забяспечваць трывалае і надзейнае разуменне новага матэрыялу.

Рэалізацыя другога правіла – запамінання, як і разумення, – вельмі працаёмкі працэс, таму важна навучыцца карыстацца прыёмамі прадукцыйнага запамінання. Вось некаторыя з іх.

**1.** Важнае значэнне для больш трывалага запамінання тэксту мае так званая паўната ўспрыняцця. Калі чытаеш тэкст пра сябе, паўната ўспрыняцця будзе адной, калі чытаеш яго ўслых, ды яшчэ робіш выпіскі найбольш важных навуковых палажэнняў, паўната ўспрыняцця будзе іншай, большай.

**2.** Адным з важнейшых прыёмаў запамінання з'яўляецца паўтор вучэбнага матэрыялу. Існуюць тры спосабы паўтарэння: а) канцэнтраваны (не размеркаваны па часе), б) размеркаваны па часе і в) камбінаваны.

- Сутнасць канцэнтраванага спосабу ў тым, што паўторы ідуць адзін за другім, пакуль вучэбны матэрыял не запомніцца. Гэты спосаб прымяняецца тады, калі матэрыял невялікі.

- Паўтор з размеркаваннем па часе прымяняецца ў тым выпадку, калі трэба запомніць дастаткова вялікі матэрыял. Сутнасць яго ў тым, што спачатку чытаецца поўны тэкст. Пасля змест яго разбіваецца на лагічныя часткі. Вядзецца запамінанне кожнай з гэтых частак. Калі ўсе часткі замацоўваюцца ў памяці, тэкст пераказваецца цалкам.

- Камбінаваны спосаб запамінання сумяшчае ў сабе першыя два спосабы. Ен прымяняецца тады, калі тэкст кнігі вялікі і складаны па змесце.

Трэба ўзяць за правіла весці запісы пры чытанні любой навуковай і спецыяльнай літаратуры. Гэта садзейнічае лепшаму засваенню прачытанага, дае магчымасць захоўваць неабходныя матэрыялы ў зручным для карыстання выглядзе, скарачае час на пошук дадзенай крыніцы пры паўторным звароце да яе.

Аднак запісы могуць быць рацыянальнымі толькі ў тым выпадку, калі выконваюцца агульнапрынятыя патрабаванні па іх вядзенні. Існуе шэраг

практычных прыемаў, накіраваных на тое, каб запісы ў працэсе чытання займалі як мага менш часу, і на тое, каб імі ў далейшым можна было легка карыстацца. Для гэтага трэба імкнуцца, па-першае, да лаканічнасці, па-другое, да выкарыстання розных скарачэнняў і, па- трэцяе, да нагляднасці запісаў. Яны павінны быць размешчаны так, каб з іх дапамогай выяўляліся лагічныя сувязі і іерархія паняццяў. Рабіць гэта можна з дапамогай сістэмы загалоўкаў, падзагалоўкаў, а таксама шляхам падзелу тэксту на абзацы, падкрэсліванняў, нумарацыі і г.д. І нарэшце, практычная рэкамендацыя – запісы звычайна вядуцца на адной старонцы ліста. Пры гэтым паскараецца пошук і сістэматызацыя матэрыялаў, захоўваецца магчымасць рабіць устаўкі ў тэкст.

Наколькі існуюць розныя мэты і ўмовы чытання навуковай, вучэбнай і спецыяльнай літаратуры, настолькі могуць быць рознымі і віды тых запісаў, якімі гэта чытанне суправаджаецца. <u>Асноўныя з іх – гэта план, канспект, тэзісы,рабочыя запісы.</u>

**План** – самы кароткі від запісаў. У ім толькі пералічваюцца пытанні, адлюстраваныя ў кнізе. Складанне плана–важны этап самастойнай працы над кнігай, які дапамагае чытачу выявіць кола пытанняў, закранутых у ёй, устанавіць сувязь паміж часткамі, прывесці ў стройную сістэму прачытанае і трывала засвоіць яго. Складанню плана, як правіла, папярэднічае аналіз тэксту, вылучэнне ў ім складаных частак. У практыцы самастойнай работы з кнігай выкарыстоўваюцца розныя тыпы планаў. Прасцейшы–гэта структурны план. Ён адпавядае структуры вывучаемага твора. За аснову такога плана бярэцца пералік асноўных раздзелаў і параграфаў.

Найбольш складаны – гэта план-канспект, які ўключае ў сябе акрамя плана тэмы пісьмовы пераказ прачытанага з доказамі і асабістымі рэмаркамі. Карыстаючыся планамі, можна лёгка аднаўляць у памяці змест любога твора.

Самай разгорнутай формай запісаў з’яўляецца **канспект.** У ім у скарочаным выглядзе адлюстроўваецца сутнасць твора. Канспек- таванне дапаможнікаў, навуковых кніг і артыкулаў – неабходная ўмова правільнай арганізацыі самастойнай вучэбнай працы. Яно дапамагае выпрацоўваць навыкі стройнага, лагічнага выкладання думак у пісьмовай форме, вучыць аналізаваць змест вывучаемай кнігі, вылучаць галоўнае. Без навыкаў канспектавання немагчыма перайсці да стварэння ўласных навуковых тэкстаў.

Канспект павінен быць добра аформлены. Запісы ў ім пажадана рабіць чарнілами і разборліва. У тэксце канспекта абавязкова павінны быць спасылкі на крыніцы. Гэта неабходна для таго, каб у любы час можна было праверыць адпаведнасць тэксту першакрыніцам. Трэба падкрэсліваць найбольш важныя палажэнні, вылучаць розныя па змесце раздзелы. Для падкрэслівання выкарыстоўваюцца каляровыя алоўкі, фламастары, маркеры. Мэтазгодна рабіць абзацы і запісы так званымі ўступамі, калі важныя меркаванні запісваюцца з вызваленнем больш шырокага поля злева або справа.

Найбольш распаўсюджанымі прыёмамі канспектавання лічацца наступныя:

-тэкстуальнае – скарочаны даслоўны запіс усіх галоўных палажэнняў, высноў і абагульненняў з мінімумам доказаў, выкладзеных у творы;

- свабоднае – сціслы запіс найбольш істотных палажэнняў твора, выкладзеных сваімі словамі;

- комплекснае – больш шырокая форма запісу, у якой выкарыстоўваецца некалькі відаў запісаў (план, тэзісы, ілюстрацыі, прыклады, доказы, цытаты і інш.), а таксама даецца аналіз прачытанага матэрыялу з улікам выкарыстання асноўнай і дадатковай літаратуры.

***<u>Пры канспектаванні пажадана прытрымлівацца наступнай методыкі запісаў.</u>***

1. Уважліва прачытаць тэкст, нічога не прапускаючы, засвоіць яго і пасля зрабіць запіс. Калі вы не можаце выкласці матэрыял сваімі словамі, значыць, матэрыял яшчэ не засвоены

2. Весці запісы дакладна, сцісла і зразумела.

3. Размяшчаць запісы ў строгай паслядоўнасці, адпаведна логіцы кнігі ў цэлым, а таксама асобных яе раздзелаў і параграфаў.

4. З мэтай удакладнення запісаў пакідаць палі, а іншы раз і цэлыя старонкі (на іх запісваюцца і асабістыя меркаванні).

5. Кожную новую думку запісваць з чырвонага радка.

**Тэзісы** каротка перадаюць асноўны змест кнігі. Гэта – яе асноўныя палажэнні. Для таго каб скласці тэзісы, патрабуецца дастаткова поўнае засваенне зместу твора, дакладнае ўяўленне аб яго асноўнай ідэі і галоўных палажэннях.

Тэзісы складаюцца наступным чынам. Пасля папярэдняга азнаямлення тэкст чытаецца яшчэ раз. Пры гэтым ён падзяляецца на шэраг урыўкаў, якія адрозніваюцца нейкай адной галоўнай думкай.

Далей, добра асэнсаваўшы вылучаныя ўрыўкі, фармулююць іх змест (асобныя палажэнні). Гэта і будуць тэзісы. Складанню тэзісаў можа папярэднічаць складанне плана як прасцейшага віду запісаў.

У саміх тэзісах не павінна утрымлівацца іх абгрунтаванне, аднак іншы раз бывае карысна пасля кожнага тэзіса ўнізе даць кароткі пералік тых фактаў, якія прыводзяцца аўтарам у пацвярджэнне сваіх палажэнняў.

Тэзісы бываюць наступных відаў: простыя, пабудаваныя без прыцягнення фактычнага матэрыялу; складаныя або разгорнутыя, з тлумачэннямі, аргументацыяй, доказамі; камбінаваныя, у якіх адны палажэнні аргументуюцца, іншыя ж даюцца без тлумачэнняў.

Пад **рабочымі запісамі** разумеюць розныя дапаможныя занатоўкі, якія робяцца непасрэдна пры чытанні кнігі і выкарыстоўваюцца потым пры складанні планаў, канспектаў, тэзісаў. Даслоўныя выпіскі з тэксту называюцца цытатамі. Цытаты павінны заключаць у сабе закончаную думку і ў дакладнасці паўтараць аўтарскі тэкст.

***<u>Асноўныя правілы цытавання заключаюцца ў наступным.</u>***

1. Спачатку трэба асэнсаваць асноўныя палажэнні тэмы і толькі пасля цытаваць вытрымку.

2. Цытата павінна адлюстроўваць закончаную думку аўтара.

3. Не дапускаюцца ніякія скажэнні ў словах і сказах, прынятых у тэксце.

4. Калі ў сярэдзіне цытаты прапускаюцца некаторыя ўводныя сказы або асобныя словы, то замест іх ставіцца шматкроп'е; калі дапускаюцца пропускі не ў сярэдзіне сказа, а ў пачатку ці ў канцы, то шматкроп'е ставіцца адпаведна пасля ўводных ці перад заключнымі двухкоссямі.

5. Цытаты павінны дакументавацца, гэта значыць утрымліваць спасылкі на крыніцу з указаннем аўтара твора, загалоўка, месца і года выдання, старонкі.

Такім чынам, вы даведаліся аб асноўных прынцыпах арганізацыі самастойнай працы студэнтаў. Гэта –творчы працэс і кожны ўносіць у яго нешта сваё, індывідуальнае. Але ва ўсіх выпадках самастойная навучальная праца павінна насіць сістэмны і рэгулярны характар. Толькі тады яна прынясе плённыя вынікі.

### *Як правільна падрыхтаваць рэферат?*

Слова «рэферат» знаёма кожнаму яшчэ са школы. Але напісаць якасны рэферат атрымліваецца далёка не ва ўсіх. Прычынай з'яўляецца неразуменне таго, што такое рэферат і як трэба яго пісаць.

Рэферат — гэта пісьмовая работа, у якой студэнт коратка раскрывае пэўную тэму, абапіраючыся на апублікаваныя матэрыялы. Сказанае азначае, што для напісання рэферата студэнт павінен азнаёміцца са спецыяльнай літаратурай (вучэбнай, навуковай, навукова-папулярнай; манаграфіямі, артыкуламі, тэзісамі, рэцэнзіямі), а потым выкласці разглядаемыя факты і высновы, да якіх прыйшлі аўтары прааналізаваных прац. Ад студэнта, такім чынам, не патрабуецца нейкіх навуковых адкрыццяў ці іншых звышскладаных дзеянняў — трэба толькі адэкватна, без скажэнняў, перадаць погляды аўтараў, падаючы матэрыял лагічна, лаканічна і без памылак. Выконваючы такую работу, студэнт не толькі атрымлівае інфармацыю па абранай тэме, але і вучыцца самастойна шукаць літаратуру і працаваць з ёй. Такія ўменні і навыкі спатрэбяцца ў далейшым, — напрыклад, пры напісанні курсавых і дыпломнай работ.

Рэфераты бываюць манаграфічнымі і аглляднымі. Манаграфічны рэферат ствараецца па адной кнізе або артыкулу (звычайна, прынцыпова важнай навуковай працы) і ўяўляе сабой больш-менш падрабязны канспект. Аглядны рэферат ствараецца па некалькіх кнігах, артыкулах і г.д. і ўяўляе сабой агляд найбольш важнай літаратуры па пэўнай тэме.

***<u>Для напісання якаснага рэферату патрэбна:</u>***

1. Атрымаць самае агульнае ўяўленне аб тэме. Інфармацыю практычна па любой тэме можна адшукаць хаця б у адной з наступных энцыклапедый: «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Вялікае княства Літоўскае», «Беларуская энцыклапедыя», «Большая советская энциклопедия» і г.д.:

2. Прааналізаваць навуковую літаратуру па вызначанай тэме (падручнікамі, дапаможнікамі, ВМК, манаграфіі, артыкулы і інш);

3. Выбраць і перадаць асноўны факталагічны матэрыял сваімі словамі. У выпадку неабходнасці можна прыводзіць цытаты, якія абавязкова афармляюцца належным чынам (бяруцца ў двухкоссе, суправаджаюцца пазначэннем аўтара і спасылкай на цытуемую работу). Цытатамі не варта злоўжываць;

4. Скласці папярэдні план рэферата, дакладней, асноўнай часткі. План у далейшым можна змяніць, удакладніць;

5. Скласці спіс выкарыстанай літаратуры (у алфавітным парадку). Не забудзьце, што ў тэксце на ўсю выкарыстаную літаратуру трэба рабіць спасылкі выгляду [1, с. 16; 5, с. 52, 57-59; 8]. Лічбы 1, 5 і 8 тут — гэта парадкавыя нумары кніжак і артыкулаў у вашым спісе выкарыстаных крыніц і літаратуры, а лічбы, якія ідуць пасля «с.» — пазначэнне старонак. У выпадку немагчымасці даць спасылку на старонку (напрыклад, інтэрнэт-версія без разбіўкі на старонкі) пазначаецца толькі нумар крыніцы (як з № 8).

## ***Структура і афармленне рэферата***

Рэферат можна здаваць у рукапісным, раздрукаваным ці электронным выглядзе.

Любы рэферат складаецца з тытульнага аркуша, зместа, уводзін, асноўнай часткі, заключэння і спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры.

На тытульным лісце ўказваецца назва ВНУ (Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт) кафедра, на якой выконваецца работа (кафедра “Гісторыя, сусветаня і айчынная культура”), прадмет (гісторыя Беларусі), тэма работы, прозвішча і ініцыялы аўтара, курс і нумар групы, а таксама прозвішча і ініцыялы выкладчыка, горад і год выканання работы. Ва ўводзінах аўтар пазначае актуальнасць тэмы, аб’ект, прадмет, мэту і задачы работы, падае агульныя звесткі па тэме. Што гэта такое, можна паглядзець у метадычных рэкамендацыях па напісанні дыпломнай або курсавой работы. Аб’ём уводзін — 1-2 старонкі. Асноўная частка — гэта і ёсць той тэкст, які вы ствараеце. Самі словы «Асноўная частка» пісаць не трэба. Заключэнне — гэта падвядзенне высноў, да якіх вы прыйшлі. Звяртайце ўвагу на тое, што высновы, асноўная частка і задачы павінны суадносіцца. Калі вы ва ўводзінах ставілі задачай нешта прааналізаваць, гэта абавязкова павінна быць прааналізавана ў асноўнай частцы і падсумавана ў заключэнні. Аб’ём заключэння — таксама 1-2 старонкі. У спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры ўносяцца ўсе артыкулы і кнігі, з якімі вы працавалі. Дадатак**.** Пры неабходнасці у гэтую частку рэферата змяшчаюць патрэбны ілюстратыўны матэрыял (малюнкі, карты, схемы, табліцы і інш.). Аднак гэта неабавязковая частка рэферата.

У друкаваным варыянце трэба выкарыстоўваць камп’ютарны шрыфт Times New Roman, размер 14, міжрадковы інтэрвал адзінарны, палі – 1,5 см злева, справа, зверху і знізу. Для першай страві абзаца неабходна рабіць адступленне (“чырвоная страка”). Тэкст выоўніваецца па шырыне аркуша, не

дапускаецца наяўнасць “вісячых строк”. Агульны аб’ём асноўнай часткі рэферата – 10-15 друкаваных старонак (без уліку тытульнага ліста, уводзін, заключэння і спіса выкарыстаных крыніц). Унутры рэферата адбываецца нумерацыя старонак. Нумар старонкі прастаўляецца арабскімі лічбамі у правым ніжнім баку. Тытульны ліст з’яўляецца першай старонкай, аднак лічба на ім не ставіцца. Нумерацыя пачынаецца на першай старонке “Уводзін” з лічбы “2”.

Рэфераты выконваюцца да канкрэтных семінарскіх заняткаў па вызначаных выкладчыкам тэмах. У час правядзення семінара студэнту неабходна выступіць са сваім рэфератам перад групай, пасля выступлення павінна адбыцца кароткае абмеркаванне зробленай працы.

Пры выстаўленні адзнакі за рэферат улічваецца не толькі паўната раскрыцця тэмы, лагічнасць выкладу матэрыяла, пісьменнасць аўтара, правільнасць афармлення, але і тое, як студэнт абараняе рэферат.

***Прыклад афармлення тытульнага ліста:***

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт**
**Кафедра “Гісторыя, сусветная і айчынная культура”**

**Рэферат**
па гісторыі Беларусі
на тэму “**Назва тэмы рэферата**”

**Выканаў**: студэнт групы 112122
будаўнічага факультэта БНТУ
Іваноў Сяргей Пятровіч

**Кіраўнік**: кандыдат гіст. навук,
дацэнт Багалейша С.В.

**Мінск, 2015**

## *Што сабой ўяўляе даклад і як яго падрыхтаваць.*

Немалую ролю ў самастойнай рабоце студэнта па гісторыі Беларусі займае падрыхтоўка даклада. Даклад, падрыхтаваны студэнтам, павінен уяўляць сабой самастойную работу, заснаваную на паглыбленым вывучэнні крыніц і гістарычнай літаратуры.

Даклад - гэта навуковая праца, адзін з відаў вуснага выступлення, пабудаваны ў лекцыйнай форме паведамлення, уяўляе сабой разгорнутае публічнае выступленне, якое тычыцца паглыбленага выкладання пэўнага пытання або тэмы.

Адрозніваюць наступныя віды дакладаў: навуковы даклад і навучальны даклад. Да вучэбных дакладах ставяцца школьныя даклады, студэнцкія даклады і любыя іншыя даклады, якія рыхтуюцца навучэнцамі вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў па заданні выкладчыка.

У навучальным працэсе даклад носіць функцыю дадатковай крыніцы інфармацыі для лекцый, пры гэтым у якасці тэмы дакладу прапануюцца факультатыўныя пытанні для самастойнага вывучэння. Такі падыход дае магчымасць выкладчыку ацэньваць самастойную працу навучэнцаў, уменне працаваць з крыніцамі інфармацыі, прамоўніцкія навыкі, а таксама дапамагае дапаўняць навучальны працэс новым матэрыялам. Студэнт у ходзе падрыхтоўкі дакладу на тэму (тую ці іншую) набывае новыя веды, фарміруе важныя навукова-даследчыя ўменні, асвойвае метады навуковага пазнання, удасканальвае навыкі публічнага выступу.

Падрыхтоўка даклада патрабуе сур'езнай даследчай працы, якая павінна ўключаць у сябе наступныя этапы.

Вывучэнне найбольш важных і актуальных навуковых работ і навуковых тэкстаў (напрыклад, кніг, артыкулаў, дысертацый і іншых навуковых даследаванняў) па тэме дакладу (у выпадку навучальнага дакладу пералік, як правіла, вызначаецца выкладчыкам).

Аналіз вывучанага матэрыялу з вылучэннем найбольш значных з пункту гледжання раскрыцця тэмы дакладу фактаў, меркаванняў і навуковых палажэнняў.

Абагульненне вывучанага матэрыялу і лагічнае пабудова матэрыялу дакладу ў форме разгорнутага плана.

Напісанне тэксту дакладу ў адпаведнасці з патрабаваннямі навуковага стылю.

## *Як падрыхтаваць даклад?*

Работа над дакладам скаладаецца з наступных асноўных этапаў:

1. Азнаямленне па падручніках з праблемай увогуле (не толькі з тэмай даклада, але і з эпохай, да якой адносіцца абраная тэма).
2. Вывучэнне спецыяльнай літаратуры.
3. Вывучэнне першакрыніц (дакументаў азначанай эпохі).

4. Распрацоўка плана даклада і ўзгадненне яго з выкладчыкам. Пытанні плана фармулююцца студэнтам самастойна і дэманструюць праблемнасць абранай тэмы. План павінен уключаць не больш за 4 – 5 пытанняў.

5. Напісанне даклада. Пытанні тэмы неабходна выкладаць паслядоўна.

Мэтазгодна рабіць вывады па асобных пытаннях і даць агульны вывад альбо заключэнне па ўсёй рабоце.

6. Афармленне даклада. Работа пачынаецца з тытульнага ліста і зместу (узор афармлення глядзіце ніжэй). Затым ідзе выкладанне уступу, асноўнай часткі і заключэння. Завяршаецца даклад спісам выкарыстаных крыніц. Пры афармленні неабходна звярнуць ўвагу на правільнае афармленне даведачнага апарату: спасылкі на дакументы і літаратуру лепш рабіць па тэксце, у адпаведнасці з нумарацыяй па спісе крыніц; напрыклад: [3, с.45]. Работа друкуецца альбо акуратн апішацца на паперы фармату А-4, старонкі нумаруюцца; пакідаюцца палі.

**Структура дакладу**, як правіла, індывідуальная і залежыць ад асаблівасцяў навуковай працы і тэмы даклада, аднак традыцыйна ўключае ў сябе тры часткі.: уступ (уводзіны), асноўная частка, заключная частка.

Уступленне. Фармулюецца тэма дакладу, вызначаецца месца разгляданай праблематыкі сярод іншых навуковых праблем і падыходаў, даецца кароткі агляд крыніц, на матэрыяле якіх раскрываецца тэма і інш.

Асноўная частка. Выкладаецца асноўны матэрыял у форме звязнага, паслядоўнага, доказнага апавядання, пазбаўленага непатрэбных адступленняў і паўтораў.

Заключэнне. Падводзяцца вынікі, фармулююцца высновы, падкрэсліваецца значэнне разгледжанай праблемы і інш.

Пры выступленні з дакладам трэба строга прытрымлівацца плана.

### *Алгарытм адпрацоўкі прапушчанага практычнага занятку*

Прапушчаны студэнтам практычны занятак абавязкова неабходна адпрацаваць упазааўдыторны час. Для гэтага студэнт самастойна рыхтуе рэферат па прапушчанай тэме і афармляе яго належным чынам. Пасля падобнай самастойнай распрацоўкі тэмы і студэнт абараняе рэферат перад выкладчыкам.

Дадзеныя метадычныя рэкамендацыі не могуць ахапіць усё кола пытанняў, звязаных з вывучэннем гісторыі Беларусі, і прадугледжваюць толькі дапамогу студэнтам пры самастойнай падрыхтоўцы да заняткаў. У дадзеным практыкуме вы знойдзеце падрабязную тэматыку практычных заняткаў па гісторыі Беларусі, а таксама метадычныя парады для падрыхтоўкі студэнтада семінара.

***Тэматычны план по абавязковым модулі «Гісторыя»***
***(Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)***

| Назва раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | | СРС |
|---|---|---|---|---|
| | Усяго | з іх | | |
| | | Лекцыі | Семінары | |
| ***Тэма 1.*** Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі» | 2 | 2 | | 4 |
| **Раздзел I.** Фарміраванне беларускага этнасу і дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях | **14** | **8** | **6** | **16** |
| ***Тэма 2.*** Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу | 4 | 2 | 2 | 4 |
| ***Тэма 3.*** Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX – XVIII стст. | 6 | 4 | 2 | 6 |
| ***Тэма 4.*** Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.) | 4 | 2 | 2 | 6 |
| **Раздзел II.** Станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту ў XX-пачатку XXI ст. | **18** | **8** | **10** | **18** |
| ***Тэма 5.*** Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917 – чэрвень 1941 гг.) | 4 | 2 | 4 | 4 |
| ***Тэма 6.*** Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны | 4 | 2 | 2 | 4 |
| ***Тэма 7.*** БССР: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа ў пасляваенны перыяд (1945 – 1991 гг.) | 4 | 2 | 2 | 4 |
| ***Тэма 8.*** Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI ст. | 4 | 2 | 2 | 6 |
| **Усяго:** | **34** | **18** | **16** | **38** |

# ПЛАНЫ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## *Семінар 1. Асаблівасці фарміравання беларускай народнасці і этнасу*

### План

1. Гісторыя Беларусі як састаўная частка ўсходнеславянскай і агульнаеўрапейскай гісторыі.
2. Асноўныя падыходы да вывучэння гісторыі. Перыядызацыя айчыннай гісторыі.
3. Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель.
4. Пачатак рассялення славян (VI ст.) і славянізацыя балтаў.
5. Паходжанне назвы "Белая Русь".

***Асноўныя паняцці***:
гісторыя, перыядызацыя, фармацыйны і цывілізацыйны падыходы, палеаліт, мезаліт, неаліт, археалагічная культура, праабшчына, родавая абшчына, племя, неалітычная рэвалюцыя, спажывецкая гаспадарка, паляванне, збіральніцтва, вытворчая гаспадарка, земляробства, жывёлагадоўля, ганчарства, ткацтва, прадзенне, фіна-угры, бронзавы век, жалезны век, кавальства, этнагенез, індаеўрапейцы, балты, славяне, каланізацыя, славянізацыя, асіміляцыя, германцы, крывічы, дрыгавічы, радзімічы, лядна-агнявое земляробства, гарадзішча, “вялікае перасяленне народаў”, язычніцтва, політэізм, анімізм, фетышызм, татэмізм, магія, капішча, этнас, этнагенез, старажытнаруская народнасць, “Белая Русь”, Чорная Русь, Чырвоная Русь, этнічная самасвядомасць, менталітэт, саманазва, “тутэйшыя”, беларусы, Літва, аўкштайты, жэмайты, прусы, беларусцы, русіны, ліцвіны, тэорыя «заходнерусізму», нацыянальная самасвядомасць.

### Тэмы рэфератаў

1. Летапісы як гістарычныя крыніцы.
2. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны (археалогія, этнаграфія, нумізматыка, геральдыка, сфрагістыка).
3. Я. Карскі і яго праца “Беларусы.”
4. Асноўныя канцэпцыі паходжання індаеўрапейцаў.

### Паведамленні

1. Асноўныя канцэпцыі паходжання назвы “Белая Русь”

## *Семінар 2. Палітычная гісторыя беларускіх зямель у IX - XVIII ст.ст.*

## План

1. Станаўленне і развіццё феадальных адносін на беларускіх землях (VIII – перш. пал. XIII стст.).
2. Першыя дзяржавы княствы на тэтырорыі Беларусі (IX- перш. пал. XIII стст.).
2. Беларускія землі ў складзе Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага: палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё (сяр. XIII – перш.пал. XVI стст.).
3. Беларускія землі ад Люблінскай уніі (1569 г.) да падзелаў Рэчы Паспалітай (канец XVIII ст.)
4. Духоўная спадчына Беларусі IX-XVIII стст.

***Асноўныя паняцці, што тычаца дзяржаўнага і палітычнага лад:***
дзяржаўнасць, "Кіеўская Русь", Куявія, Славія, варагі, хазары, гаспадар, рада (паны-рада), пярэдняя рада (лава), вальны сейм (сойм), павятовы соймік, маршалак земскі, гетман, канцлер, падскарбій, ваявода, падваявода, кашталян, староста, харунжы, маршалак павятовы, ваяводства, павет, магдэбургскае права, магістрат, гарадская рада, гарадская лава, войт, бурмістр, радца, лаўнік, судзебнік Казіміра (1468), статуты ВКЛ (1529, 1566, 1588), прывілеі (Казіміра 1447, Аляксандра 1492), трыбунал ВКЛ, суды (гродскі, земскі,падкаморскі, копны, вотчынны), Крэўская ўнія (1385), Гарадзельская ўнія (1413); Люблінская унія (1569), Кейданская унія (1655), паланізацыя, "залатыя шляхецкія вольнасці", "польскі народ шляхецкі", ідэалогія сарматызму (сарматызм), інкарпарацыя, федэрацыя, Кароль, Вальны сейм (сойм) (ардынарны, экстраардынарны, канвакацыйны, элекцыйны, каранацыйны, пацыфікацыйны), Пасольская ізба, Сенат, "Генрыхавы артыкулы", "Pacta conventa", "ліберум вета", канфедэрацыя (Сандамірская, Торуньская, Слуцкая, Барская, Таргавіцкая), дысідэнты, Канстытуцыя 3 мая 1791 г., "нямыя сеймы" (1717, Гродзенскі 1793), саслоўна-прадстаўнічая манархія; Расія, Швецыя, Аўстрыя, Прусія; шышы; казацкія загоны; касінеры, віленскія якабінцы, Найвышэйшая Літоўская рада, Дэпутацыя Вялікага княства Літоўскага.

***Асноўныя паняцці, што тычацца грамадскага і сацыяльна-эканамічнага ладу:***
феадалізм, феадальная раздробленнасць, удзельныя княствы, міжусобныя войны, мангола-татары, шлях "з варагаў у грэкі", валокі, дзядзінец, князь, баяры, дружына, вотчына, халопы, закупы, радовічы, удачы, ізгоі, смерды, верв, палюддзе, пасаднік, тысяцкі, цівун, ключнік, падвойскі, епіскап, воласць, "Руская праўда". веча, рада, станы (саслоў'і), феадалы (шляхта, магнаты, паны, баяры), сяляне (людзі пахожыя, людзі непахожыя, чэлядзь невольная, закупы, слугі, цяглыя, асадныя (чыншавыя), даннікі, дольнікі, агароднікі, бабылі), мяшчане (рамеснікі, партачы, купцы, госці, прасолы, чорныя людзі), духавенства, павіннасці (паншчына, чынш, дзякла, даніна),

прыгоннае права, цэхі, юрыдыкі, “Устава на валокі” (1557), фальварак,валока, дым, служба, саха; фальварак, фальваркава-паншчынная сістэма, сялянскія павіннасці (падымнае, паншчына, чынш, дзякла, гвалты, талокі, згоны, жарнавое, угайнае, ялавічнае, чопавае, вепраўшчына, куніца, гіберна, рэйтаршчына), Скарбовая камісія (1760-1770-я гг.), рэформы І. Храптовіча, рэформы А. Тызенгаўза, мануфактура (Свержэнская, Налібокская, Урэцкая, Слуцкая. нясвіжская, Карэліцкая), фабрыка, каралеўская эканомія, “персіярня” (Ян Маджарскі), канал Агінскага, Паланецкі універсал (1794).

***Асноўныя паняцці, тэрміны і назвы:***
крыжакі, Ордэн мечаносцаў, Лівонскі ордэн, Тэўтонскі ордэн, харугва, татара-манголы, ярлык, тумен, Залатая Арда, Галіцка-Валынскае княства, Маскоўскае княства, Навагрудак, Вільня, “Пагоня”, “Кведлінбургскія анналы”Польшча.

***Асноўныя паняцці, што тычацца царкоўна-рэлігійных адносін:***
Берасцейская (Брэстская) царкоўная ўнія (1596), уніяцтва, грэка-каталікі (уніяты), іезуіты, інквізіцыя, рэфармацыя, контррэфармацыя, евангелікі, пратэстантызм, лютэранства, кальвінізм, арыянства, цвінгліянства, дысідэнты, Марцін Лютэр, Жан Кальвін, Пётр Скарга, Іпацій Пацей, Іасафат Кунцэвіч, Мікалай Радзівіл Чорны, Сымон Будны, Васілій Цяпінскі.

## Тэмы рэфератаў

1. Барацьба Полацкага княства з крыжакамі ў канцы XII – першай палове XIII ст.ст.
2. Праблема ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага ў гістарычнай навуцы.
3. Саюз ВКЛ з Польшчай: яго плюсы і мінусы (Крэўская унія 1385 г\
4. Прававая і судовая сістэма ВКЛ, асноўныя помнікі прававой думкі.
5. Роля і месца культуры Беларусі ў еўрапейскім культурна-цывілізацыйным працэсе.
6. Культурна-асветніцкая дзейнасць езуітаў на землях Беларусі.
7.Гістарычныя партрэты: С.Баторый, Л.Сапега, С.Панятоўскі.
8. Шляхта і магнаты РэчыПаспалітай у XVIII ст.
9. Біяграфічныя партрэты Вялікіх князеў літоўскіх

## Паведамленні

1. Полацкі князь Усяслаў Чарадзей – адметная асоба беларускай гісторыі.
2. Культурна-асветніцкая дзейнасць Кірылы Тураўскага.
3. Ефрасіння Полацкая: жыццё і дзейнасць.
4. Вытокі беларускага этнасу. Канцэпцыі паходжання назвы «Белая Русь».
5. Леў Сапега – выдатны беларускі дзеяч сярэднявечнай Беларусі.
6. Грунвальдская бітва.
7. Ф. Скарына як вучоны, гуманіст, асветнік і першадрукар.
8. Ідэі гуманізма ў паэзіі М. Гусоўскага.

9. Царкоўна-рэлігійныя адносіны ў ВКЛ і РП.
10. Бітва 1708 г. пад Лясной.
11. Т. Касцюшка – нацыянальны герой
12. Сімвалы самакіравання беларускіх гарадоў.
13. Мой горад у часы ВКЛ.

**Прэзентацыі**

1. Полацкая і Гарадзенская школы дойліцтва: характэрныя рысы. помнікі.
2. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва на беларускіх землях у IX-XIII стст.
3. Беларуская архітэктура ў др. пал. XIII – п. п. XVI ст.
4. Батлейка – беларускі народны тэатр
5. Барока ў беларускім мастацтве.
6. Нясвіж і Радзівілы.
7. Слуцкія паясы – шэдэўры беларускага мастацтва.

**Канспект:**

**1. Культурнае развіцце беларускіх зямель у IX - XIII стст.** *(пісьменнасць (Кірыл і Мяфодзій), жанры літаратуры (летапісы, царкоўная літаратура, найбольш значныя творы); развіцце архітэктуры (культавая і абарончая: помнікі, тэхніка выканання); манументальны жывапіс (фрэскі, мазайка); іконапіс і кніжная мініяцюра; дэкаратыўна-прыкладное мастацтва; дзейнасць хрысціянскіх асветнікаў (Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аврамій Смаленскі).*

**2. Культура беларускіх зямель у другой палове XIII – першай палове XVI стст.** *(фарміраванне беларускай мовы; роля царквы і манастыроў у распаўсюджванні пісьменнасці і развіцці літаратуры (дзейнасць А. Смаленскага, мітрапаліта Кіпрыяна); развіцце летапісання і найбольш значныя летапісныя помнікі; развіццё кнігадрукавання ў ВКЛ, першыя друкарні; паэзія (М. Гусоўскі, Я. Вісліцкі, А. Рымша; друкаваная літаратура (Ф. Скарына); Рэнесанс на беларускіх землях (характэрныя рысы, асаблівасці беларускага Адраджэння); іконапіс, свецкая жывапіс (партрэт).*

